# Няпросты шлях да гармоніі

**У зале беларускай літаратуры НББ распачалася выстаўка пад назвай «Праз пакуты — да шчасця», прымеркаваная да стагоддзя з дня нараджэння драматурга, празаіка і публіцыста Алеся Махнача (1922—2001).**

Алесь Махнач належыць да пакалення пісьменнікаў, чый шлях у творчасці выкрышталізоўваўся пад уздзеяннем нялёгкіх, але гераічных падзей Вялікай Айчыннай вайны. У чэрвені 1941 года сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці, быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. Пасля вызвалення з канцлагера ў 1945 годзе лячыўся ў ваенных шпіталях, атрымаў інваліднасць.

Экспазіцыя дэманструе жанравую разнастайнасць літаратара. Многія яго творы трапілі пад вокладку калектыўных зборнікаў, іншыя выходзілі асобнымі кнігамі, а таксама ў перыядычных выданнях. Да ўвагі наведвальнікаў — «Драматычныя мініяцюры», «Да пары збан ваду носіць...», «Усе ідуць у нагу», «Мы будзем жыць», «Дзеці крэпасці», «Няхай красуе жыццё», «Камандзір Усходняга форта», а таксама творы з серыі «Ведаць свой край Беларусь» — краязнаўчыя нататкі «Нізок» і «Забалацце».

Асобны раздзел выстаўкі прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху Алеся Махнача. Наведвальнікаў тут чакаюць да 29 верасня.

**Аліса БРАТКА**